УДК 373.3.016

***А.І. Цітаева***
(ДУА «Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва»)

**ВЫКАРЫСТАННЕ АЎТАРСКІХ ЭЛЕКТРОННЫХ АДУКАЦЫЙНЫХ РЭСУРСАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ЎЗБАГАЧЭННЯ СЛОЎНІКАВАГА ЗАПАСУ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ**

*Разгледжаны магчымасці выкарыстання дыска «Беларускія нацыянальныя святы і традыцыі» на ўроках беларускай літаратуры з мэтай пашырэння слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў.*

Паводле дадзеных перапісу насельніцтва Беларусі 2009 г. беларускую мову назвалі роднай 60% жыхароў нашай краіны, аднак размаўляюць на ёй толькі каля 30% насельніцтва. Для большасці вучняў нашай краіны першай мовай, якую яны чуюць, з'яўляецца руская. Сапраўднае беларускамоўнае асяроддзе звычайна адсутнічае. Адсюль узнікаюць цяжкасці ў моўным развіцці малодшых школьнікаў.

Гэтыя цяжкасці, як паказвае практыка, звязаны таксама з недастатковасцю лексічнага запасу малодшых школьнікаў, што значна збядняе іх магчымасці ў наладжванні міжасабовых зносін.

Вырашэнню гэтых праблем могуць садзейнічаць урокі беларускай літаратуры, на якіх выкарыстоўваюцца аўтарскія электронныя адукацыйныя рэсурсы (далей – АЭАР). Зацікавіўшы вучняў прыгожымі вершамі, чароўнымі казкамі, легендамі, прывабным апісаннем прыроды, мы маем магчымасць абудзіць у малодшых школьнікаў жаданне вывучаць і ведаць родную мову, а ў далейшым і размаўляць на ёй.

Сучасныя псіхолагі адзначаюць, што дзеці нашага часу – гэта дзеці экраннай дынамічнай інфармацыі. Інфармацыя на экране манітора, праектара ці тэлевізара ўспрымаецца імі нашмат лепш, чым друкаваная кніжная інфармацыя [1].

Таму я вырашыла выкарыстоўваць камп'ютарныя тэхналогіі, якія адкрываюць зусім новыя, тэхналагічныя варыянты навучання.

Мая практыка паказала, што навучальныя заняткі з мультымедыйнай падтрымкай па вучэбных прадметах і пазакласных мерапрыемствах праходзілі досыць паспяхова і вельмі падабаліся дзецям: яны заўсёды выяўлялі цікавасць і актыўнасць. Па выніках гэтай работы я стварыла дыск «Беларускія нацыянальныя святы і традыцыі».

Дадзены электронны рэсурс змяшчае матэрыял аб найбольш распаўсюджаных у Беларусі нацыянальных святах і традыцыях: Раство Хрыстова і Калядкі, Масленіца, Вялікдзень, Троіца, Купалле, Пакроў, Дзяды. Увесь матэрыял размеркаваны па раздзелах: апісанне свята (уключае гісторыю паходжання, апісанне традыцый і звычаяў), сцэнарыі, мультымедыйныя прэзентацыі, відэаролікі, фотаздымкі, песні, гульні, віктарыны.

Я заўважыла, што заняткі з выкарыстаннем гэтага АЭАР ствараюць цудоўнае асяроддзе для зносін дзяцей на роднай мове, значна ўзбагачаюць іх слоўнік, надаюць яму рухомасць і жывасць.

Гэта прывяло да ідэі стварэння шэрагу практыкаванняў, з дапамогай якіх можна не толькі зацікавіць вучняў новым матэрыялам, але і стварыць спрыяльная ўмовы для пашырэння лексічнага запасу іх слоўніка і прымянення атрыманых ведаў у зносінах з аднакласнікамі.

Для таго, каб прывабіць дзяцей да гэтай работы, актывізаваць іх пазнавальны інтарэс да роднага беларускага асяроддзя, я стала знаёміць першакласнікаў з нацыянальнымі святамі пры дапамозе створаных мною мультымедыйных прэзентацый.

Да пэўнага моманту амаль усе першакласнікі ўжо валодалі мінімальным наборам слоў па тэме, а галоўнае – вялікім жаданнем вывучыць словы сцэнарыя, гульні, песні, каб самім паўдзельнічаць у святкаванні.

Менавіта гэтае вялікае жаданне я і выкарыстала ў другім класе на ўроках беларускай літаратуры для пашырэння слоўнікавага запасу дзяцей. З матэрыялаў дыска я стала падбіраць неабходны для ўрокаў матэрыял. Дастаткова выбраць сказ з любога раздзела, ўрывак з песні, рэпліку са сцэнарыя, гульню, слайд або іншую нагляднасць і выкарыстаць яе на пэўным этапе ўрока: арганізацыйным, для моўнай размінкі, на этапе падрыхтоўкі да актыўнага засваення ведаў ці падчас адпачынку, на фізкультхвілінцы.

Форму работы над выбраным матэрыялам я падбірала ў залежнасці ад класа, падрыхтаванасці дзяцей, задач, зместу ўрока, ад набліжэння пэўнага свята.

Адным з выдатнейшых сродкаў навучання, які стварае цудоўныя ўмовы для папаўнення слоўнікавага запасу вучняў пачатковых класаў, з'яўляецца гульня. А калі гульня спалучаецца з выкарыстаннем тэлевізара або праектара, то вынік атрымліваецца яшчэ больш значным.

На ўроках беларускай літаратуры выкарыстоўваю лексічныя гульні, якія развіваюць уменне падбіраць патрэбнае па сэнсу слова, вызначаць значэнне слоў. У гэтых гульнях дзеці апісваюць прадметы, выдзяляюць характэрныя ім прыкметы, па апісанні адгадваюць прадмет, знаходзяць прыкметы адрознення і падабен-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

ства, вучацца разважаць. Таксама гульні са словамі развіваюць кругагляд у малодшых дзяцей, іх разумовыя здольнасці. А калі ўзнікаюць цяжкасці, то на дапамогу прыходзіць нагляднасць на экране тэлевізара (камп'ютара) або тэкставая падказка.

Сюды ж можна далучыць і гульні-драматызацыі. Малодшых школьнікаў вабіць магчымасць непасрэднага ўдзелу ў драматызацыях, іх песеннасць і нацыянальны каларыт, яркасць касцюмаў і весялосць пры падрыхтоўцы і правядзенні свята. Гэта самыя жаданыя і «жывыя» практыкаванні, у якіх можна праявіць свае веды, выкарыстаць засвоены матэрыял. Удзел у абрадавых гульнях (Цярэшка, Яшчар, Заінька) спрыяе ўзбагачэнню слоўніка дзяцей вобразнымі эпітэтамі, пяшчотнымі ласкавымі словамі, якія яны павінны навучыцца гаварыць адзін аднаму.

Садзейнічаюць пашырэнню слоўнікавага запасу дзяцей і заданні-дабаўлянкі, у якіх трэба дадаць да фразы апошнія словы. Гэтыя заданні прывучаюць вучняў уважліва слухаць сказ, верш (урывак з абрадавай песні), падбіраць патрэбныя па сэнсу словы.

Амаль у кожны ўрок чытання можна ўключыць прыказкі ці прымаўкі, характэрныя для таго ці іншага свята, якія могуць мець выгляд дэфармаванага або незакончанага сказа, які трэба аднавіць або закончыць пры дапамозе малюнка на экране. Гэта садзейнічае не толькі ўзбагачэнню слоўнікавага запасу, фарміраванню выразнага вуснага маўлення, але і замацаванню правільнага вымаўлення гукаў.

Найцікавейшая работа над значэннем слова, разуменнем яго сэнсу і ўключэннем у свой актыўны слоўнік – гэта работа з блізкімі і процілеглымі па значэнні словамі (сінонімамі і антонімамі). Такія практыкаванні вучаць дзяцей шукаць патрэбнае слова, узбагачаюць іх мову, даказваюць, што для дакладнага і правільнага выказвання заўсёды трэба падбіраць найбольш трапныя словы.

Выкарыстанне аўтарскіх электронных адукацыйных рэсурсаў на ўроках беларускай літаратуры мае важнае значэнне ў стварэнні спрыяльных умоў для моўнага развіцця вучняў, актыўнага ўсвядомленага вывучэння імі асаблівасцей беларускага маўлення, для развіцця іх творчай і інтэлектуальнай дзейнасці; значна павялічвае ўзровень камфортнасці навучання, змяншае трывожнасць; дазваляе ўнесці элементы займальнасці, садзейнічае павышэнню цікавасці да вывучэння прадмета; стварае ўмовы для выхавання патрыятызму і павагі да нацыянальных традыцый. Я мяркую, што ўменні і навыкі, атрыманыя маімі вучнямі ў пачатковай школе, дапамогуць ім у вывучэнні беларускай мовы і літаратуры ў старэйшых класах, зробяць родную мову больш зразумелай, блізкай і цікавай.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Обухова, Л.Ф. Возрастная психология : учеб. пособие для вузов / Л.Ф. Обухова. – М. : Пед. о-во России, 2001. – 440 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова